# Красамоўная адметнасць майстра

МАСТАК УЛАДЗІМІР МАСЛЕНІКАЎ УСПРЫМАЕ РОДНУЮ ПРЫРОДУ ЯК КРЫНІЦУ ТВОРЧАГА НАТХНЕННЯ



Прозвішча Масленікавых шырока вядомае ў колах беларускіх мастакоў, у асяроддзі аматараў жывапісу. Імпульс гэтаму даў Павел Масленікаў, народны мастак Беларусі. А сёння яго сын — Уладзімір Масленікаў — з'яўляецца яркім прадаўжальнікам мастацкіх традыцый. Вядома ж, Уладзімір мае свой творчы твар, работы яго вядомыя і цікавыя. Але ад паняцця "дынастыя" ніяк не адысці, тым больш што ў сям'і Масленікавых ёсць і новыя пераемнікі мастацкай спадчыны. Але аб гэтым крыху пазней.

Мы сустрэліся з Уладзімірам Масленікавым у яго майстэрні. Але ўжо напярэдадні гутаркі аб творчасці, аб дынасгыі ў мяне склалася даволі поўнае уяўленне аб ім як аб мастаку. Безумоўна, Уладзімір Масленікаў належыць датаго пакалення беларускіх мастакоў, творчасць якіх увабрала лепшыя традыцыі нацыянальнай жывапіснай школы. Кожнае жывапіснае палатно мастака напоўнена колеравай гармоніяй, маляўнічая палітра аўтара стрыманая і сугучная спакойнаму каларыту роднай беларускай прыроды. Свет прыгажосці прысутнічае ва ўсіх творах Масленікава: ці гата партрэты, ці эпічныя пейзажы роднай прыроды.

Ужо больш за трыццаць гадоў Уладзімір Масленікаў з пэндзлямі і фарбамі даследуе вядомьтя і разгм з тым яшчэ нязнеданыя беларускія прасторы. Ён шукае і знаходзіць усё новыя матывы, паколькі даўно адкрыў для сябе, што родная зямля здольная пастаянна здзіўляць вока мастака сваімі незвычайнымі прыроднымі ландшафтамі. У жывапісца склаўся свой вобразны стыль пейзажа, у якім пераважае малюяак бязмгжнай прыроднай прасторы. У гэтага таленавітага беларускага жывапісца так шмат індывідуальных знаходак, што яму ўсё лягчэй адкрываюцца цал сам новыя творчыя перспектызы. Ідэя бязмежнай прасторы, вобразна закадзіраваная ў пейзажных рашэннях Уладзіміра Масленікава, абавязкова прадугледжвае ўвядзенне ў ***ка***рцінную плоскасць высокага неба, яхое вабіць сваім невычарпальным касмічны.м блакітам. Ёсць у мастака і такія сімвалічныя кампазіцыі, дзе нябесныя вяршыні прачэрчаны "велічэзнымі горамі" цёмных хмар або працятыя сонечнымі промнямі, што прарываюцца скрозь воблачнае марыва. 'Гакая вобразная стыхія надае аблiччу роднай зямлі ў жывапісным яе бачанні вялікую значнасць і выразнасць, што адпавядае яе натуральнай прыгажосці, чысціні і першапачатковасці.

***— Што стапа вызначальным для вас у выбары прафесіі мастака? Калі гэта прыйшло?***

— Вызначальным стала тое, што бацька быў мастаком. А калі прыйшло? У чатыры гады я яшчэ не маляваў, але ўжо гаварыў, што буду мастаком і шафё-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



"Беларускія прасторы". 2004 г.

рам. У выніку так і атрымалася, толькі я стаў заўзятым вадзіцелем-аматарам. На машыне езджу з трынаццаці гадоў.

***— Напэўна, скпадана знаходзіцца ў святле такой зоркі, як ваш бацька, народны мастак Беларусі Павел Масленікаў. Разам з тым, вы — мастак Уладзімір Масленікаў. Як вам удаецца мець свой стыль, сваю стылістыку пісьма, як удаецца быць арыгінальным мастаком?***

— Пачнём з таго, што гэта вельмі складана. Асабліва калі ты малады мастак, толькі што скончыў ВНУ. Практычна паўжыцця прыходзілася даказваць, што я не толькі сын Паўла Масленікава, але і сам з сябе нешта ўяўляю. Таму, калі скончыў інстытут, першыя гады прынцыпова не выстаўляўся на выставах пейзажаў, я выстаўляўся ў асноўным партрэтамі: каб не параўноўвалі з бацькам. Потым паступова нрыйшоў да пейзажа, таму што гэта блізка мне. Партрэты пішу таксама.

***— Чым вы захапляліся ў творчасці бацькі?***

— Захапляўся працаздольнасцю. Ён напружана працаваў усё жыццё. Мяне на эцюды ўсё дзяцінства вазіў з сабою. Хочаш не хочаш, праявілася любоў да

— пейзажа. Мы аб'ездзілі ўсю Беларусь.
Калі ехалі ў Крым, абавязкова везлі з сабою палотны, кардон, эцюднікі. У Гурзуф паехалі — усе людзі на пляж, мы ў горы на эцюды. Па чатыры эцюды ў дзень пісалі. Настолькі гэта прышчапілася, што я ўжо сам нікуды без эцюдніка не езджу. З жонкай паехалі ў Крым, яшчэ маладыя былі, таксама эцюднік узяў, ужо ніхто мяне не прымушаў.

***— Вы і сёння чішаце беларускую прыроду, пейзажы. Вы адчуваеце блізкасць да сваёй зямлі? Вы хочаце выказаць гэтыя пачуцці ў сваіх работах? Або пішаце тое, што падабаецца?***

— Я практычна цяпер не выязджаю з Беларусі: сям'я, дача, вёска. Але ў Беларусі ёсць такія выдатныя і разнастайныя месцы: і раўніны, і азёры, і ўзгоркі. Кожны стан беларускай прыроды прыгожы па-свойму: і снег, і дождж, і сонца. Я вельмі люблю сваю радзіму.

Мастак Уладзімір Масленікаў успрымае беларускую прыроду як першакрыніцу невычарпальных творчых азарэнняў, дзе вядучай дамінантай з'яўляецца імкненне да ўзнятага, гарманічнага адчування рэальнага свету і пачуццё жывой сувязі пры пазачасавым прыродным сузіранні з дагістарычнымі эпохамі, калі зараджалася

міфалагічная сувязь усіх з'яў жыцця. Такая парадыгма творчага мыслення аўтара апраўдвае сябе пастаянным абнаўленнем жывапісных метадаў і прыёмаў. Напрыклад, каларыстычнае сугучча ўсіх матываў роднай зямлі нястомна падкрэсліваецца мастаком станам іх веснавога, летняга росквіту, калі яркія колеры ажываюць у золаце сонца і зеляніны палёў, тонуць у глы-

бокім блакіце неба. Уладзімір Масленікаў адзін з нямногіх сучасных беларускіх мастакоў, які ў дасканаласці валодае градацыяй цёплых і халодных колераў, і яму па-майстэрску ўдаецца перадаць паветраную прастору, пераліўы сонечных промняў у лістоце дрэў, у палявых "хвалях" маладых каласоў, у жывым люстэрку воднай роўнядзі. Таму яго жыццесцвярджальныя па сваім вобразным і каларыстычным стане пейзажы заўсёды блізкія і трапяткія, яны натуральна выхоўваюць пачуццё прыгожага.

Акрамя неаглядных панарам мастак часта звяртаецца да больш камерных матываў ціхіх затокаў, лясных сцяжынак, бярозавых гаёў. Гэтыя сюжэты напоўнены тонкім унутраным станам. Іх можна назваць "астраўкамі" прыродных уражанняў, што часта адкладаюц-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



"На беразе возера". 2003 г.

ца ў памяці з ранняга дзяцінства. Такія жывапісныя матывы запатрабаваныя нашымі сучаснікамі, многія з якіх часцяком адарваныя ад натуральнага прыроднага асяроддзя, дзе нарадзіліся і выраслі, а жывуць у даволі аднастайным гарадскім асяроддзі. Такую праблему чуйна ўсведамляе гэты жывапісец і спрабуе па магчымасці рассунуць рамкі "бетоннай рэальнасці" і вярнуць дзякуючы творчай здольнасці пачуцці і эмоцыі сваіх шматлікіх прыхільнікаў у зялёнае царства прыроды.

***— Вы любіце пісаць вялікія палотны або памер палатна не мае значэння?***

— Я пішу розныя памеры. Але мне чамусьці падабаюцца вялікія палотны. Там можна размахнуцца. У мяне сюжэты ў большасці эпічныя: пейзажы — панарамныя, далёкія, яны прадугледжваюць і фармат вялікі.

***— Бацька бачыў вашы работы? Быў нейкі творчы абмен думкамі або настаўленні? Як адбывалася ўсё? Можа, бацька гаварыў, што не так ты робіш, сынок?***

— Бацька вельмі быў скупы на пахвалу, з аднаго боку. Ён лічыў, што, калі ты скончыў інстытут, гэта яшчэ не значыць, што стаў прафесійным мастаком. Усё роўна павінен напрацоўвацца вопыт. І нават калі да мяне сталі прыходзіць першыя ўдачы, бацька — мы працавалі ў адной майстэрні — не ўмешваўся ў маю творчасць. Пакуль я не спытаю што-небудзь. Хоць ён быў валявы чалавек, але далікатна паводзіў сябе. Пахвала заключалася ў нейкай іншасказальнасці. Ён, напрыклад, мог прыйсці з выставы і заявіць: "Ты ведаеш, мае хлопцы сказалі (а яго хлопцы — гэта яго пакаленне мастакоў): "Павел, ты ведаеш, твой сын са свайго пакалення вылучаецца". Гэта азначала вышэйшую пахвалу.

***— Вам, пэўна, было прыемна чуць гэта?***

— Вядома. Тым больш, ведаючы характар бацькі, я разумеў, што гэта пахвала. Гэта нейкае прызнанне. Я настолькі з павагай стаўлюся да свайго бацькі, што самая вышэйшая пахвала для мяне — ад яго. Калі ён прызнаў, значыць гэта нядрэнна. Як і сын мой таксама (Павел Масленікаў, унук П. В. Масленікава. — Рэд.). Калі вучыўся ў акадэміі, я прыйшоў на прагляд і сказаў: "Ты так вырас". А яму паставілі не вельмі добрыя адзнакі. Ён сказаў пасля прагляду: "А мне ўсё роўна, што мне паставілі, я хоць першы раз ад цябе пачуў, што добрыя работы. А то ў мастацкай школе мне добрыя адзнакі ставілі, а ты мяне ўвесь час лаяў".

***— Вы самі сказалі, што сын ваш таксама ідзе тым жа шляхам. Значыць, дынастыя Масленікавых як мастакоў працягваецца. Але як вы — думаеце: чаму ваш сын таксама стаў мастаком?***

— Больш за тое, у мяне малодшы сын Аляксей цяпер на дызайнера вучыцца. І нявестка — мастак. Што датычыцца Паўла, то калі яму было пяць гадоў, я яго не мог выцягнуць з майстэрні. Мабыць, было ўжо наканавана. Яшчэ такі момант. Я ў гэтай справе магу яму нешта падказаць, накіраваць. Натуральна, нешта і ў яго атрымліваецца. Я ў дзяцінстве гаварыў, што буду мастаком, хоць не вельмі разумеў, што гэта такое. Бацька тады яшчэ ў тэатры працаваў мастаком-пастаноўшчыкам (я вырас, можна сказаць, у оперным тэатры). Калі прыклад перад вачамі, гэта вельмі ўплывае.

***— Калі пісаў ваш бацька, быў адзін час, цяпер іншы. Як можна ахарактарызаваць гэты творчы рух? Ці мяняецца працэс?***

— Мажа быць. Калі ўзяць апошнія 30 гадоў, то больш напрамкаў раскрылася. Я рэаліст, але я лічу, што гэта добра, калі шмат напрамкаў у творчасці. Добра, што мы не аднолькавыя.

***— Менавіта сённяшні час — спрыяльны для творчасці?***

— У савецкі час былі дзяржзаказы. Камусьці падабалася. А цяпер жа вельмі індывідуальна. Нехта запатрабаваны, нехта не вельмі. Для мяне гэты час спрыяльны для творчасці. І дзяржава падтрымлівае, і работы набываюцца. Гэта добра, што мастацтва запатрабаванае.

***— Наколькі вы ўлічваеце кан'юнктуру? Калі пішаце карціну, вы хочаце, каб яна спадабалася? Або вы пішаце толькі тое, што хацелі б выказаць?***

— У мяне, на шчасце, супадае: тое, што хачу пісаць, падабаецца іншым. Гэта шчасце.

***— Якое творчае крэда мастака Уладзіміра Масленікава?***

— Праўда жыцця.

***— Вы мастак, больш схільны да рэалістычнага выяўленчага мастацтва?***

— Я пішу з натуры. Мною напісаныя сотні эцюдаў у розных кутках Беларусі. Як маленькія раўчукі збіраюцца ў вялікую раку, так і натурныя эцюды з'яўляюцца асновай у рабоце над вялікім кампазіцыйным пейзажам, які адлюстроўвае прыгажосць нашай роднай прыроды. Галоўнае, каб вынік быў такі, што паглядзелі на работу, і вам захацелася прыйсці туды, да берага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— ракі. У мяне быў такі выпадак. Я напісаў пейзаж, скампанаваны поўнасцю, без натуры, назваў "Лепельскія азёры" (рэгіён у Віцебскай вобласці. — Рэд.). Прыйшоў вадзіцель, які возіць карціны на выставы, і спытаў: "Гэта што?" Я гавару: "Лепельскія азёры". "Сапраўды. Я там рыбу лавіў", — сказаў ён. Але ж гэта было ўяўнае месца.

У рабоце павінен быць стан пазнавання. Адсюль і жаданне прайсці па намаляваным полі. Я свае адчуванні і маё эмацыйнае ўспрыманне прыроды імкнуся праз свае творы перадаць будучаму гледачу.

***— Вам лёгка гэта ўдаецца?***

— Па-рознаму. Бывае, работа вельмі хутка атрымліваецца, бывае, мучышся, перарабляеш, перакампаноўваеш. А можаш мучыцца і ў выніку нічога не даб'ешся. Такое рэдка, але бывае.

***— Па-вашаму, сёння рэалістычная манера не здае сваіх пазіцый? Вядома, што ў Еўропе жывапіс больш імкнецца да абстрактных формаў. Як па-вашаму, мы павінны ганарыцца тым, што ў нас школа рэалістычнага жывапісу існуе і што ў нас ёсць прыклады мастакоў, якія годна ў гэтай сферы працуюць?***

— Я думаю, што мы павінны ганарыцца гэтым. Але рэалістычны жывапіс усё-такі здае пазіцыі. Моладзь усё

— менш і менш гэтым мастацтвам валодае. Нават калі хтосьці і займаецца, то на слабым узроўні. Але я не прыхільнік падзелу: рэалізм не рэалізм. Галоўнае, каб было прафесійна. Прафесійнае і адукаванае мастацтва павінна быць. А ў якім жанры і ў якім напрамку ты працуеш — гэта не важна. Да мяне неяк прыязджалі італьянцы. Якая была школа жывапісу ў Італіі! Усё, нічога няма. У нас яна ёсць! І ў Акадэміі мастацтваў падрыхтоўчая школа вельмі добрая.

***— Вам працай ацэньваць, таму што вы самі шмат гадоў займаецеся педагагічнай працай. Напэўна, бачыце, хто ў нас падрастае, якая змена. Як у нас ідзе справа з заўтрашнім днём у выяўленчым мастацтве?***

— Я лічу, трэба чалавека навучыць. Як ён будзе працаваць, калі стане прафесіяналам, гэта ўжо яго справа, але школу ён атрымаць павінен прафесійную. Павінен усё ўмець. Трэба ісці ў іншыя напрамкі не ад таго, што ты ўмееш, а ад таго, што ты сваім розумам прыйшоў да гэтага. Што ты хочаш менавіта так працаваць!

***— А як вы ставіцеся да ўдзелу ў выставах?***

— Я як скончыў мастацкі інстытут, то ўдзельнічаў практычна ва ўсіх рэспубліканскіх выставах: і групавых, і персанальных, якіх у мяне было



"Ціхі дзень". 2005 г.

— ўжо не менш за пяць. Выстаўляюся пастаянна і лічу, што гэта трэба, каб убачыць сябе сярод іншых. Часам работа, здаецца, нічога, а на выставе яна падаецца малацікавай. Або наадварот. Выставы патрэбныя, каб бачыць сябе. І ацэньваць рэальна і аб'ектыўна.

***— З улікам таго, як развіваецца сфера выяўленчага мастацтва, яго заўтрашні дзень якім вам уяўляецца? Гэты працэс не абрываецца?***

— Я думаю, усё будзе нармальна. Старэйшае пакаленне гаворыць: вось мы былі такія, а моладзь не такая. Ды такая ж моладзь, як і мы былі раней. Я аптыміст.

***— Вы самакрытычныя?***

— Я вельмі самакрытычны. Нават часам мне гэта перашкаджае.

***— А што вы лічыце галоўным у сваёй творчасці?***

— Удасканальвацца ў тым жа напрамку, у якім я працую. Няма мяжы ўдасканаленню. Я хачу працаваць і ў пейзажы, і ў партрэце, і, магчыма, у нацюрморце. Я стараюся ў розных жанрах сябе паспрабаваць. Вельмі падабаецца пісаць партрэты: розныя вобразы, розныя характары.

***— Вы можаце напісаць партрэт любога чалавека?***

— Так. Але пішу звычайна тых, хто мне цікавы. Больш за ўсё пісаў сваіх блізкіх — бацькі, маці, дзяцей, сястру. Калі чалавек цікавы не толькі духоўна, але і знешне ёсць цікавыя вобразы, тады, вядома, цікавей пісаць.

Так, Уладзімір Масленікаў праявіў сябе і як назіральны і вельмі тонкі псіхолаг у жанры партрэта. Ён паказвае людзей, якіх добра ведае і любіць. Перш за ўсё гэта вельмі цёплыя і прывабныя партрэты яго бацькі, маці, сястры. Мастак заўсёды знаходзіць у сваіх мадэлях самыя лепшыя чалавечыя якасці. Таму яго партрэтная галерэя пастаянна папаўняецца новымі вобразамі сучаснікаў, якія жадаюць бачыць сваё жывапіснае пераўвасабленне, давяраючыся таленту мастака.

***— Ці знаёмае вам такое паняцце, як творчая няўдача або застой?***

— Няўдачы бываюць, вядома. Але яны адносныя. Я магу палічыць нейкую работу няўдалай, а глядач гэтага і не заўважыць. І наадварот. А застой? Працаваць проста трэба, вось і ўсё. Як гавораць, будзеш чакаць натхнення, можна і не дачакацца. Прыйшоў, узяў пэндзаль у рукі — натхненне прыйдзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



'Сакавік". 2006 г.

***— Ёсць музей імя вашага бацькі ў Магілёве. Там шмат яго работ? Музей запатрабаваны? Работы даюць людзям магчымасць даведацца больш пра мастака Паўла Масленікава?***

— Гэта абласны мастацкі музей імя Масленікава. Там шмат работ бацькі. Ёсць крыло, дзе знаходзіцца персанальная галерэя народнага мастака Беларусі Паўла Масленікава. Там тры залы і мемарыяльны пакой. Вельмі вялікія фонды. Таму што бацька сам шмат сваіх работ туды перадаў. Пасля яго смерці я яшчэ перадаў больш за сорак жывапісных работ, эскізы дэкарацый, касцюмаў. Вельмі шмат усяго. Я лічу, што там яго самыя лепшыя работы знаходзяцца. Ён жа практычна перадаў усю сваю выставу васьмідзесяцігоддзя. А гэта, безумоўна, этапныя работы. Ён раней у Мінску выстаўляўся, а потым у Магілёў паехаў і падарыў усё гэта гораду. Спачатку галерэю адкрылі, потым музею імя прысвоілі, калі ён памёр. Я кожны год туды езджу. Там праходзяць міжнародныя пленэры па жывапісе. На пленэры прыязджаюць мастакі з усяго СНД, з далёкага замежжа: Францыі, Аўстрыі, Сербіі, Балгарыі, Полынчы і іншых краін. Прыходзяць на экскурсію школьнікі. Усе вельмі захапляюцца. Потым нават праводзяць выязныя выставы з лекцыямі. Там работа ідзе. Будынак музея вельмі цікавы, з мінулага стагоддзя. Добрую рэстаўрацыю зрабілі, рамонт. І маіх там работ ужо больш за сорак.

Жывапісныя пошукі дазваляюць яму знаходзіць магчымыя адказы і на актуальныя філасофскія пытанні, звязаныя з крытэрыямі творчасці. Не будзе перабольшаннем сказаць, што сёння Уладзімір Масленікаўз'яўляецца адным з самых уражальных беларускіх майстроў сучаснага пейзажа. Аўтар такіх значных кампазіцый, як "Беларускія прасторы", "Полацкія далячыні", "Азёрны край", мэтанакіравана распрацоўвае эпічны цыкл, прысвечаны беларускай прыродзе. Ён знаходзіцца ў росквіце сваіх творчых сіл, і кожны новы твор прыўносіць у мастацкі багаж новыя жывапісныя старонкі.

***— А скажыце, сёння мастак можа сваімі карцінамі зарабляць на жыццё? Як вы гаварылі, раней былі дзяржзаказы, сёння іх няма. Гэта горш або лепш для мастака?***

— Калі былі заказы, тады вельмі мала набывалася работ па-за імі. Цяпер заказаў няма, але ў мяне, напрыклад, больш набываюць карцін, чым раней, арганізацыі, проста грамадзяне ў галерэях. Калі мастак не будзе прадаваць свае работы, мала таго, што сям'ю не забяспечыць, а проста не забяспечыць сябе матэрыяламі, каб напісаць новую работу, не зможа аплочваць творчую майстэрню.

***— Вам удаецца адсочваць мастацкі працэс, які працякае ў іншых краінах?***

— Я магу меркаваць аб гэтым толькі зыходзячы з пленэраў, якія праводзяцца — ў нас. Пленэры рэалістычныя. Мастакі
розных краін працуюць у розных напрамках сучаснага жывапісу. Традыцыі рэалістычнай школы ўсё ж найбольш моцныя ў Расіі, Беларусі, Украіне. Беларускія мастакі годна прадстаўляюць рэалістычную школу і паказваюць высокі прафесійны ўзровень.

І ўсё-такі на пейзажах Уладзіміра Масленікава варта спыніцца асабліва. Пейзажы, якія ён пісаў і якія стварае сёння, — гэта паэтычныя навэлы аб роднай зямлі, напісаныя з майстэрствам, з бездакорным мастацкім густам. Сярод іх асабліва добрыя тыя, у якіх тонка, дакладна, з дзіўна вострым адчуваннем жыцця прыроды, яе станаў апяваецца вобраз роднай зямлі.

Пейзажы Уладзіміра Масленікава не проста любімая тэма мастака — гэта поўнае выражэнне яго творчай асобы, яго пошукаў і дасягненняў. Гэта тое непасрэднае і паэтычнае, чым зачароўвае яго мастацтва і знатака, і простага гледача. Пейзажы яго праўдзівыя, напоўненыя стрыманым лірызмам, вобразныя. Аўтара пазнаеш адразу, без подпісу, па асаблівым характары жывапісу, у якім гарманічна спалучаецца дакладнасць узнаўлення жыцця з глыбокай паэтычнасцю, вернасць малюнка з прыгажосцю каларыту. А галоўнае, па тым нацыянальным каларыце, які пранізвае ўсю творчасць Уладзіміра Масленікава.

Мастак так добра вывучыў родную прыроду, бачыць у ёй столькі прыгожага, што яму няма чаго далёка хадзіць. Невычарпальныя багацці матываў, станаў, тонкіх маляўнічых адносінаў ён адкрывае пад Мінскам, на Магілёўшчыне, і кожны раз гэта нешта новае, якое ўзбагачае гледача, прымушае яго, калі ён і не мастак, больш пільна узірацца ў навакольны свет, горача яго любіць.

***— А вы не навязваеце сваю манеру камусьці іншаму?***

— Не, ні ў якім выпадку. Я не хачу, каб усе так пісалі. За апошняе дзесяцігоддзе вельмі шмат сустракаў копій сваіх работ у розных месцах. Навошта навязваць сваё. Наадварот, мастаку трэба пастарацца знайсці сваю нішу. Я ўсіх заклікаю займацца сваёй справай і старацца ў сваім напрамку ўдасканальвацца і дабівацца поспехаў. Чым больш розных мастакоў, тым лепш.

***— Часта ў ранніх работах мастака часам знаходзіш больш цікавага, чым у яго далейшай творчасці.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Як адбывалася ў вас? Калі вы былі больш маладым, успрыманне свету было іншым?***

— У студэнцкія гады шмат успрымалася па-іншаму. Адзін час вельмі падабаўся Рэната Гутуза, я нават камгіязіцыі рабіў пад яго, пад яго стылістыку. Усё рабіў тады менш усвядомлена. Былі хістанні: туды-сюды... Чурлёніс вельмі падабаўся — рабіў рэчы пад яго. Гэта быў пошук. Але ўсё роўна я прыйшоў да таго, што раблю сёння. З гадамі я ўдасканальваюся. Калі ўзяць мае работы 25-гадовай даўнасці — яны нашмат слабейшыя, чым тое, што я зраблю цяпер. Непараўнальна. Думаю, што правільнай дарогай іду. Без усялякіх скачкоў, паступова — усё вышэй і вышэй.

Эцюд эцюду розніца. Бываюць эцюды, якія нічога не гавораць ні розуму, ні сэрцу гледача, у іх пануюць выпадковасць у выбары матыву і знарочыстая нядбайнасць формы. Эцюды Уладзіміра Масленікава іншыя. Яны выдаюць вя лікую жывапісную культуру майстра, беспамылковую вастрыню вока. Дбайна адбірае ён усё тое, што тыповае для нашай прыроды, што нараджае ў душы хваляванне, што вабіць сінімі далямі, свабодным разводдзем рэк...

***— Не надакучвае пісаць?***

— Атрымліваю задавальненне ад гэтага. Л ічу, што я — шчаслівы чалавек. Як

— і многія мастакі, якія займаюцца сваёй
любімай справай. Ім гэта падабаецца, і яшчэ часам грошы за гэта плацяць. Гэта ж шчасце. Бывае, перапрацаваўся, тады я ўлетку езджу на дачу. Там таксама ў мяне ёсць майстэрня. Бываюць перапынкі, часам цэлы тыдзень за пэндзаль не бяруся. Я не рыбак, не паляўнічы, адно хобі — аўтамабілі. Калі я тыдзень не парулю, рукі свярбяць.

***— У вашых работах ёсць зборны вобраз?***

—Так, вядома. Я лічу, што на такіх вя -
лікіх фарматах, як у мяне, не можа быць натурнай работы. Гэта ўжо кампазіцыйная карціна, напрыклад, гэтая (паказвае на работу, якая вісіць у майстэрні). Яна называецца "Мая Беларусь". Зборны вобраз — нашы прасторы, азёры. У мяне, можна заўважыць, практычна ўсюды прысутнічае вада. Азёры, лясы і далі — усё гэта наша Беларусь. Карціна ўжо скончана. Яна ўжо пабывала на выставе "Традыцыі і сучаснасць".

Цікавы спосаб перадачы прасторы ў пейзажах Уладзіміра Масленікава. Амаль заўсёды моцна сцвярджаецца першы план, а за ім разгортваюцца далі, прасторы, якія гавораць аб велічы і размаху роднай зямлі. У работах адчуваецца вялікае дыханне, шырокі далягляд у спалучэнні з пільным по-



"Апошняе фота мірнага часу". 2005 г.

галасы прыроды, адшукваць у роднай прыродзе яе непаўторныя рысы, яе нацыянальны характар. Аб'ектыўная прыгажосць свету, убачаная і перададзеная ў мастацкім вобразе, — гэта і ёсць майстэрства выхавання пачуццяў чалавека, узрушанасці ў гледачу глыбокіх эмоцый. Гэтым жа і дарагія нам цудоўныя пейзажы.

***— Сваю персанальную выставу не намячаеце ў бліжэйшы час?***

— Мае персанальныя выставы праходзілі ў розныя гады ў Палацы Рэспублікі, у Палацы мастацтваў, у Магілёўскім абласным мастацкім музеі, у мінскай галерэі "Мастацтва", у Беларускім універсітэце фізічнай культуры.

***— Мабыць, аўтарская выстава да многага абавязвае?***

— Персанальную выставу трэба рабіць не спантанна. Я звычайна яе канцэпцыю прадумваю за год. Павінен ведаць, у якім памяшканні яна пройдзе, якой мяркуецца экспазіцыя, якія работы мне патрэбныя. А патрэбныя розныя работы, каб яны гарманіравалі паміж сабою. Адным словам, персанальная выстава — гэта вельмі складаны працэс і да яго трэба падыходзіць творча.

Гаворачы аб карцінах Уладзіміра Масленікава, нельга не вяртацца зноў і зноў да таго яркага нацыянальнага каларыту, якім афарбавана ўся яго творчасць. Уладзімір Масленікаў — гэта беларускі мастак, якому па-сапраўднаму дарагія і блізкія гісторыя, культура, прырода роднай краіны.



"Азёрны край". 2010 г.

Віктар **Міхайлаў**

РЕПОЗИТОРИЙ БГ